# Творчасць — гэта перадусім праца



**Неўзабаве выпускнікі школ пачнуць "штурмаваць" прыёмныя камісіі ВНУ. Чым унікальная сёлетняя ўступная кампанія, што дае мэтавае накіраванне і якія спецыяльнасці запатрабаваны на рынку працы — наша гутарка з рэктарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Наталляй Карчэўскай.**

**— Наталля Уладзіміраўна, ці лёгка патрапіць у лік студэнтаў БДУКМ?**

— Перадусім заўважу: правілы паступлення ў любую вышэйшую навучальную ўстанову, не толькі сферы культуры, вызначаюцца ў адпаведнасці з беларускім заканадаўствам. Зразумела, калі абітурыент вырашае займацца творчасцю на прафесійным узроўні, ён павінен на ўступным іспыце пераканаць камісію, што здольны гэта рабіць. І для гэтага недастаткова вывучыць адзін верш ці паказаць вакальны нумар. Тут патрэбна грунтоўная падрыхтоўка.

**— Значыць, да вас без пачатковай профільнай адукацыі не варта ісці?**

— Так катэгарычна казаць нельга. Вядома, пажадана, напрыклад, закончыць дзіцячую школу мастацтваў. Наведванне адпаведных гурткоў і студый таксама дае базу для далейшага развіцця. Гэта дапамагае абітурыенту лепш паказаць сябе на ўступных выпрабаваннях і хутчэй адаптавацца да навучальнага працэсу ва ўніверсітэце.

**— А таленавітага абітурыента адразу бачна?**

— Талент сам па сабе мала чаговарты. Творчасць, мастацтва — гэта перш за ўсё праца. Доўгая, цяжкая, іншым разам нясцерпная. Толькі той, хто прыкладае шмат намаганняў, можа стаць прафесіяналам. Вучыцца ў нашым ВНУ не так проста, як падаецца недасведчанаму. Шчыраваць трэба пастаянна. А наконт таленту... Кажуць: калі ты лянуешся — значыць, ты няздольны, бо здольныя, захопленыя справай людзі не лянуюцца.

**— Універсітэт культуры — гэта найперш калыска захавання спадчыны, нацыянальных традыцый. Ці з'яўляюцца там спецыяльнасці сучаснага мастацтва?**

— Усё залежыць ад запытаў рынку працы. Важна разумець, дзе потым будзе працаваць наш выпускнік, якую карысць грамадству прынясе. БДУКМ забяспечвае фундаментальнымі ведамі: мы не рыхтуем кадры, скажам, для "Тык-Току", якім бы папулярным ён ні быў.

Летась аднавілі набор на спецыяльнасць "мастацтва мюзікла": адчувалася патрэбнасць у такіх адмыслоўцах. Па ёй сёння навучаюцца шасцёра студэнтаў. Каб набраць больш, неабходна быць упэўненым, што ўсе яны будуць забяспечаны працоўнымі месцамі.

**— А ў межах існуючых спецыяльнасцей дадатковыя напрамкі ўводзяцца?**

— Пералік спецыяльнасцей або спецыялізацый перыядычна аднаўляецца. Як прыклад, на бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці адкрылі спецыялізацыю лічбавізацыі і аналітыкі, бо работа бібліятэкара зазнала змены і патрабуе ведання спецыяльных праграм.

**— Што наконт мэтавага накіравання? Ці ёсць для гэтых абітурыентаў бонусы?**

— Яны ідуць па асобным конкурсе. Іспыты здаюць раней за астатніх, і калі не праходзяць як "мэтавікі", маюць шанц паўдзельнічаць у агульным. Дарэчы, шмат хто так і робіць — і паступае ды вучыцца.

**— Хто з заказчыкаў накіроўвае да вас абітурыентаў? Гэта перадусім аддзелы і ўпраўленні культуры райгарвыканкамаў?**

— Не толькі. Установы ўсіх форм уласнасці, што маюць патрэбу ў спецыялістах. Калі заяўка ўзгоднена мясцовымі органамі ўлады, Міністэрствам культуры, на кіраўніка ўскладаецца адказнасць пошуку абітурыентаў на гэтае месца. Прычым ён павінен забяспечыць конкурс мінімум два чалавекі. Калі ж толькі адзін абітурыент з накіраваннем падае дакументы, то гэтае месца перадаецца на агульны конкурс.

**— То-бок мэтавае накіраванне не дае гарантыю на паступленне?**

— Не, а вось на першае месца працы — так. Прычым выпускнік трапляе ў родны горад, знаёмае асяроддзе, дзе яму прасцей пачаць кар'еру. Мэтавае накіраванне не індульгенцыя на атрыманне вышэйшай адукацыі. Любы абітурыент — і з накіраваннем, і на агульных умовах — можа на ўнутраным іспыце паказаць нізкую кампетэнцыю, атрымаць незадавальняючую адзнаку і не паступіць. Кожны павінен разумець, дзе будзе вучыцца, куды потым пойдзе працаваць, і дзеля гэтага прыкладаць шмат намаганняў — але пра гэта мы з вамі ўжо гаварылі.

Ірына СТАНКЕВІЧ
Фота з архіваў герояў



**Алена Сяліцкая, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Лагойскага райвыканкама:**

— Для нас, як для заказчыка, мэтавае накіраванне на вучобу — "выручалачка" ў камплектацыі калектываў. Мы ведаем сваіх выпускнікоў, ведаем, хто на што здольны. Пад іх плануем працоўныя месцы. Так, сёлета ў Раённы цэнтр культуры пасля заканчэння каледжа прыходзіць на працу таленавіты харэограф лагайчанка Вераніка Прымшыц. Яна была тут на практыцы і ўжо зарэкамендавала сябе як годная спецыялістка.

Зразумела, што пры накіраванні на вучобу і забеспячэнні потым працоўным месцам ёсць і нейкія складнасці — а як жа без іх?.. Напрыклад, калі "мэтавік" не адпрацоўвае з нейкіх прычын неабходныя пяць гадоў, мы разам з ім салідарна цярпім адказнасць перад рэспубліканскім бюджэтам. Таму з павышанай увагай ставімся да выдачы накіраванняў: даём іх тым, хто мае цвёрды намер працаваць у сферы культуры нашага раёна і праслаўляць свой край.



**Ксенія Палякова, студэнтка факультэта мастацкай культуры:**

— У родным Бабруйску я вучылася ў тэатральнай студыі школы мастацтваў. Калі заканчвала яе, мой педагог Алеся Манько прапанавала мэтавае накіраванне ва ўніверсітэт. Дапамагла падрыхтавацца. У конкурсе на месца ўдзельнічалі з дзяўчынай з нашага раёна, і гэта была добрая канкурэнцыя. І я, і яна разумелі, што пераможа мацнейшая. Я вырашыла: калі не прайду з накіраваннем, буду паступаць на агульных умовах. Хаця ў такім выпадку вытрымаць конкурс цяжэй: адна справа, калі вы ўдвух, і іншая — абысці дзясяткі чалавек. Мне пашчасціла.

Галоўны для мяне плюс, што пасля заканчэння ўніверсітэта пайду працаваць у школу, дзе вучылася, і пакуль буду набірацца вопыту, мне дапамогуць мае педагогі. Я ўсё там ведаю, для мяне ўсё там роднае.